# ЧЫННІКІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ЛАКАЛЬНАСЦІ: КУЛЬТУРНЫ ЛАНДШАФТ І НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

***Т. М. Мармыш,***
*намеснік начальніка аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі, магістр культуралогіі*

Лакальнасць як прастора суб’ектных практык можа быць апісана з дапамогай такіх катэгорый, як «мяжа», «прыватнае», «месца», «сваё», «гетэратопія», «тут-і-цяпер». Злучае гэтыя элементы прасторава-тэрытарыяльнае вымярэнне, кантынуітэт якога прасціраецца ад яго гранічнай формы лакальнасці – цела чалавека – да краіны як сістэмы сацыякультурных локусаў ці нават шырэй. У агульным выглядзе дадзенае вымярэнне можа быць ахарактарызавана як *ландшафт* – цэласная структура, у якой спалучаюцца прыродныя (геаграфічныя) і культурныя (антрапалагічныя) фактары. Абапіраючыся на гэта, можна меркаваць аб існаванні менавіта «*культурнага* ландшафту».

Адчуванне і сімвалічная інтэрпрэтацыя чалавекам «месца» – «пачуццё месца» – робіць навакольны ландшафт псіхалагічна камфортным, асвоеным. Пачуццё месца праяўляецца ў кампанентах, прыдатных для адлюстравання эмацыянальнага і метафізічнага ўзаемаўплываў асобы і месца пражывання. Сярод іх: тапаніміка, звязаная з наданнем назваў (імёнаў) месцам; творчасць асобы, увасобленая ў лакальных матэрыяльных аб’ектах і нематэрыяльных элементах культурнай спадчыны; вопыты адаптацыі і залежнасць ад навакольнага асяроддзя і інш. Моцнае пачуццё месца жывіць лакальнасць, а вызначэнне, структураванне месцаў на ментальным узроўні дазваляюць чалавеку эфектыўна арганізоўваць жыццё, з’яўляюцца крыніцай эмацыянальнай бяспекі і разумення.

Фізічная прастора культурнага ландшафту становіцца асвоенай у працэсе культурнай дзейнасці, паколькі існаванне культурна-тэрытарыяльных локусаў немагчыма без удзелу асобы: «Калі знікае суб’ект – знікае і створанае ім месца» [1, с. 110]. У такім выпадку прастора не толькі ствараецца або трансфармуецца як фізічнае цела, але і ідэнтыфікуецца праз найменне, абазначэнне суб’ектам, асэнсаванне. Агульнасць месца (Ort), непасрэдна выражаная ў сумесным пражыванні, развіваецца ў агульнасць духу (Geist) [2, с. 25]. «Месца» як сканструяваная частка прасторы, што ўказвае на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эмацыянальныя сувязі чалавека з некаторай тэрыторыяй у паўсядзённых ці святочных практыках, праяўляецца ў стасунках асобы і сімвалічных значэннях, што яго насычаюць.

Па прычыне дыялектычнай залежнасці лакалізацыі (самавызначэння ў пэўным локусе-месцы) і ідэнтыфікацыйных працэсаў, якія яе суправаджаюць, ідэнтычнасць можна вызначыць у агульным як лакалізацыю. Так, напрыклад, П. Прэстан выдзяляе тры ўзаемазалежныя кампаненты, што складаюць сутнасць ідэнтычнасці – адчуванне і разуменне ўласнага месца, прасторы «адбывання» (ажыццяўлення) нейкага дзеяння (жыцця) (locale) праз кантэкстуалізацыю асобы ва ўзаемасувязях (network), заснаваных на памяці (memory) [3, с. 167].

Лакальнасць у традыцыйным вымярэнні звязана з жыццём традыцыйных супольнасцей, найбольш паказальным рэпрэзентатарам якіх з’яўляецца вясковая супольнасць. Лакальнасць традыцыйнай вёскі знаходзіцца па-за канструктам «цэнтр–перыферыя», які ўносіць ацэначную характарыстыку і надае значэнне першаснасці і другаснасці, бо «сваё» месца для насельніка лакальнасці саматоеснае і аўтаномнае. Іншыя месцы – «чужыя», «не-свае» – існуюць на ўзроўні знешняга атачэння; камунікацыя з імі вымагае наяўнасці абставін, адбываецца хутчэй як неабходнасць, а не звыклы парадак жыцця.

Лакалізацыя адыгрывае вызначальную ролю для вясковай супольнасці, што спрыяе фарміраванню пэўнага кшталту аксеалагічных установак і нарматыўных рэгуляцый унутры супольнасці. Найбольш каштоўнымі паняццямі, якія грунтуюцца менавіта на феномене лакальнасці, для члена вясковай супольнасці, носьбіта лакальнай ідэнтычнасці, з’яўляюцца «зямля», «дом» («хата»), «сваё», «сям’я», вялікае значэнне мае месца нараджэння і пражывання (у ідэале праз моцныя кроўна-роднасныя сувязі гэта зямля продкаў), валоданне зямлёй, наяўнасць уласнай гаспадаркі, традыцыйны ўклад жыцця.

Прыналежнасць і прыцягненне да «месца» фіксуецца ў элементах нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС). Агульнанацыянальная па сваім значэнні, па паходжанні і геаграфіі бытавання нематэрыяльная спадчына заўсёды вузкалакальная, належыць лакальным супольнасцям і існуе ў лакальнай культуры ў межах пражывання супольнасці і мясцовым ландшафце. НКС акумулюе назапашаныя пакаленнямі каштоўнасці і сэнсы, транслюе іх у навакольнае асяроддзе, адлюстроўваючы ў тым ліку каштоўнасць лакалізацыі асобы і адносін суб’екта да локусу быцця.

Элементы нематэрыяльнай культуры з’яўляюцца тыповымі для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэнтытэту супольнасці, якой належаць, унікальнымі ў сацыяльным, эстэтычным, культурным планах для лакальнай тэрыторыі, рэгіёна і знакавымі для іх насельніцтва.

Катэгорыя «элемент», якая прымяняецца да «адзінкі» нематэрыяльнай культурнай спадчыны, азначае непасрэдна саму адзінку спадчыны і ўказвае на наяўнасць яднаючага пачатку НКС і навакольнага асяроддзя, матэрыяльных аб’ектаў і іншых прыцягнутых складнікаў, якія суправаджаюць практыку існавання элемента НКС, яго прыналежнасць да носьбітаў і творцаў.

Паходжанне многіх элементаў нематэрыяльнай культуры абумоўлена прыродным асяроддзем, у су-быцці з ім элементы арганічна развіваюцца, не парушаючы лакальную экасістэму і ландшафт. Прыклад таму – балотны ландшафт Палесся, які істотна звузіў магчымасці апрацоўкі зямлі яго насельнікамі, стаў стымулам развіцця рамеснай вытворчасці – у XV ст. у вёсцы Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці склалася ганчарная традыцыя. Багатыя радовішчы гліны і бедная, малапрыдатная для земляробства глеба спрыялі развіццю ганчарнага промыслу, які на доўгія стагоддзі стаў пераважным заняткам мясцовых жыхароў.

Паміж асобай і ландшафтам існуюць раўнапраўныя суб’ект-суб’ектныя адносіны: чалавек сваім знаходжаннем і дзейнасцю ў прасторава-тэрытарыяльным локусе ўплывае на яго развіццё, згодна са сваёй інтэрпрэтацыяй рэальнасці, уласным светаадчуваннем, падпарадкоўваючы сваім унутраным законам, выбудоўвае адносіны з асяроддзем і пераўтварае яго, фарміруе непаўторны антрапагеаграфічны локус. У сваю чаргу, ландшафт уздзейнічае на асобу, што ілюструецца залежнасцю фізічнага, утылітарнага быцця чалавека ад ландшафту (напрыклад, адпаведнасць структуры і формы жылля, схемы рассялення згодна з асаблівасцямі рэльефу) і залежнасцю метафізічных, духоўных праяў (напрыклад, семантычная насычэнне топасаў ландшафту праз засяленне іх міфалагічнымі істотамі, пабудова сістэмы ўяўленняў аб навакольным свеце з улікам адметнасцей ландшафту).

Эмацыянальная і дзейнасная сувязь паміж чалавекам і ландшафтам – тапафілія – акцэнтуе ўнікальнасць прасторы і ўнікальнасць самазнаходжання і самавызначэння чалавека ў ім, разуменне самабытнасці культурнага ландшафту ў якасці рэсурсу лакальнага і рэгіянальнага развіцця. Тапафілія можа знаходзіць выражэнне ў розных сферах: у ахове культурнай спадчыны і навакольнага асяроддзя (у комплексе – культурнага ландшафту), стабілізацыі дэмаграфічнай сітуацыі, ахове, развіцці сельскай гаспадаркі і мясцовай прамысловасці. У дадзеным кантэксце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актуалізуецца праблема экалогіі культуры – погляд на культуру ў яе сувязях з культурным ландшафтам, народнай культурай, традыцыйнымі каштоўнасцямі, гістарычнымі каранямі.

Такім чынам можна зрабіць выснову, што культурны ландшафт і нематэрыяльная спадчына як чыннікі традыцыйнай лакальнасці з'яўляюцца значнымі фактарамі жыцця чалавека вясковай культуры, інспіратарамі фарміравання традыцыйнай лакальнай ідэнтычнасці, якая ўтварае асабовы ці групавы падстаўовы базіс існавання.

---


1. *Бреский, О.* Локальность / О. Бреский // Перекрестки. – 2008. – № 1. – С. 105–129.

2. *Теннис, Ф.* Общность и общество: основные понятия чистой социологии / Ф. Теннис. – СПб. : Владимир Даль, 2002. – 450 с.

3. *Preston, P. W.* Locale, Network and Memory / P. W. Preston // Political Cultural Identity. Citizens and Nations in a Global Era. – London, 1997. – P. 167–187.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ